УДК 37.013:[82+7]:378.662(476)

Н.Я. Савіцкая
(Мінск, БДТУ)

# "СЛОВА І МУЗЫКУ ГОЛАС ЯДНАЕ": З ВОПЫТУ ЛІТАРАТУРНА-МАСТАЦКАГА ВЫХАВАННЯ Ў БДТУ

4 снежня 2015 года была праведзена творчая літаратурна-музычная вечарына літаратурнага клуба "Ветліца" з удзелам замежных навучэнцаў, якая мела назву "Слова і музыку голас яднае". Прэзентацыя дзейнасці клуба была наладжана ў рамках рэспубліканскага фестывалю "F. ART.by" творчасці замежных студэнтаў устаноў вышэйшай адукацыі ў мэтах удасканальвання сістэмы маральнага, эстэтычнага выхавання і полікультурнай адукацыі моладзі. Прапанаваў правесці мерапрыемства "Нацыянальны цэнтр мастацкай творчасці дзяцей і моладзі" Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь.

Напярэдадні мерапрыемства была праведзена вялікая арганізацыйная праца. Акрамя беларускіх членаў літаратурнага клуба ў правядзенні вечарыны бралі ўдзел замежныя навучэнцы, прарэктар па выхаваўчай рабоце Гараноўскі А.Р., дэканат па рабоце з замежнымі навучэнцамі з непасрэдным удзелам дэкана Януковіч А.І., дырэктар студэнцкага клуба Яланецкі З.І., выкладчыкі кафедры беларускай філалогіі Жукоўская Т.У. і Казлякова Т.А., вакальны ансамбль выкладчыкаў "Акавіта". Неабходна было падключыць ТСН – відэаплэер, музычны цэнтр, экран, мікрафоны, – упрыгожыць залу сімволікай, атрыбутамі беларускай культуры, шарамі, наладзіць выставы творчых работ літаратурнага клуба і замежных навучэнцаў, знайсці фатографа, відэааператара і гукааператара. Усяго прынялі ўдзел у фестывальным шоу звыш 50 чалавек – студэнтаў, замежнікаў, выкладчыкаў і супрацоўнікаў. У зале прысутнічала каля 200 студэнтаў першага курса і замежных навучэнцаў, якія актыўна рэагавалі на выступленні, уключаліся ў праграму сцэнарыя вечарыны.

Акрамя арганізацыйных пытанняў, шмат прыйшлося працаваць са студэнтамі, каб падрыхтаваць якасныя выступленні.

Але, мабыць, асноўнае ў правядзенні мерапрыемства – гэта якасны сцэнарый, які неабходна прадумаць, выбраць нумары, выканаўцаў нумароў, напісаць тэкставы матэрыял для вядучых, уявіць усю карціну вечарыны, пачынаючы з простага і даводзячы да кульманацыйных пунктаў, давесці да лагічнага завяршэння, аб'ядноўваючы ўсіх прысутных прыгожым душэўным словам, музыкай, голасам, шматгалоссем моў, паэзіі, паэтаў, галасоў.